ЗАЦВЯРДЖАЮ
Кіраўнік рабочай групы
Нацыянальнага сходу
Рэспублікі Беларусь
па справах беларусаў замежжа

У.М.Гаўрыловіч
01.12.2025

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб правядзенні II Міжнароднага медыяконкурсу "Мы – разам! Ганаруся маёй Беларуссю!" сярод членаў грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа

1. Асноўныя мэты і задачы конкурсу

Конкурс праводзіцца дзеля:

далучэння членаў грамадскіх арганізацый беларускіх суайчыннікаў за мяжой да папулярызацыі культурнай спадчыны беларускага народа, падтрымкі сямейнай творчасці, падтрымкі і заахвочвання ў ажыццяўленні імі культурна-асветніцкай дзейнасці, умацавання станоўчага іміджу Беларусі і беларускага народа ў свеце.

2. Арганізатар конкурсу
Парламенцкая рабочая група па справах беларусаў замежжа.

Конкурс праводзіцца пры падтрымцы:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь;
Дзяржаўнай ўстановы культуры змешанага тыпу "Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур”.
У якасці партнёраў конкурсу могуць выступаць дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі Рэспублікі Беларусь, фізічныя і юрыдычныя асобы, якія засноўваюць свае заахвочвальныя прызы ўдзельнікам конкурсу ці іншым чынам спрыяюць рэалізацыі данага праекта.

3. Намінацыі і ўдзельнікі конкурсу

1.Намінацыя “Я малюю Беларусь” – конкурс малюнкаў на тэму “Маё любімае месца ў Беларусі”. Юным удзельнікам прапануецца намаляваць прысторы роднай зямлі, яе памятныя месцы, адлюстраваць беларускую прыроду, легендарных асоб Рэспублікі Беларусь – усё, што ім блізка, што кранае іх душу. У

намінацыі прымаюць удзел: дзеці членаў грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа ад 8 да 15 гадоў.

2.Намінацыя "Мы – беларусы!" – конкурс відэаролікаў аб культурна-асветніцкай дзейнасці грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа за перыяд з жніўня 2025 года па жнівень 2026 года.

У намінацыі прымаюць удзел: грамадскія арганізацыі беларусаў замежжа.

4. Умовы ўдзелу, тэрміны

Матэрыялы на ўдзел у конкурсе " Мы – разам! Ганаруся маёй Беларуссю!" накіроўваюцца з 1 снежня 2025 года па 1 кастрычніка 2026 года на электронную пошту Belarus.konkurs@house.gov.by , а таксама на https://t.me/+E4q2E7BbalVkOTIy і ўключаюць у сабе:

у намінацыі "Я малюю Беларусь" заяўку адвольнай формы могуць дасылаць заяўку самі ўдзельнікі і іх бацькі, з паведамленнем з якой грамадскай арганізацыі беларусаў замежжа бацькі супрацоўнічаюць; грамадскія арганізацыі беларусаў замежжа; малюнкі перасылаюцца ў фарматах JPG, PDF; ад аднаго юнага мастака – не болей 2 работ;

у намінацыі "Мы – беларусы!" заяўкі падаюць кіраўнікі грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа.

Адной арганізацыяй могуць быць прадстаўлены на конкурс не болей 2 відэазапісаў у фармаце MP4, AVI (да 5 хвілін).

5. Падвядзенне вынікаў, журы, узнагароджванне

Па меры паступлення на электронную пошту Арганізатара малюнкі і відэазапісы размяшчаюцца ў сацыяльных сетках, на тэлеграм-канале "БЕЛАРУСЫ СВЕТУ. КУЛЬТУРА. ТРАДЫЦЫІ" ( https://t.me/belarus09122025).

У склад журы ўваходзяць: кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу па справах беларусаў замежжа Гаўрыловіч Уладзімір Мікалаевіч (старшыня журы) і члены рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па справах беларусаў замежжа. Да ўдзелу ў працы журы могуць быць запрошаны прадстаўнікі Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, зацікаўленых міністэрстваў і Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, а таксама пісьменнікі, артысты, дзеячы культуры краіны. Для ацэнкі конкурсу малюнкаў запрашаюцца прафесійныя мастакі.

Падвядзенне вынікаў конкурсу праводзіцца на працягу месяца з моманту завяршэння прыняцця заявак.

У кожнай з намінацый вызначаюцца пераможцы. Колькасць прызавых месцаў не абмяжоўваецца.

Пераможцы ўзнагароджваюцца спецыяльнымі дыпломамі Рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па справах беларусаў замежжа.

Лепшыя работы конкурсу могуць быць адзначаны іншымі ўзнагародамі ўстаноў-партнёраў і падтрымліваючых конкурс мецэнатаў.